# Ад Санкт-Пецярбурга да Мінска

## У мастацкай галерэі "Універсітэт культуры" прайшла выстава "Беларусь вачыма рускіх мастакоў"

Мінчане, ды і госці сталіцы ведаюць: залы мастацкай галерэі Беларускага дзяржуніверсітэта культуры і мастацтваў знаходзяцца ў Палацы Рэспублікі. Там і ладзіўся цікавы творчы праект. Выстава — гэта плён двухтыднёвай працы расійскіх мастакоў (некаторыя з іх родам з Беларусі) пад час пленэра, што праходзіў у Полацку, Нясвіжы, Міры, Оршы, Талачыне, Мінску. А ў сваіх творах мастакі адлюстравалі прыгажосць беларускай зямлі, яе прыроды, непаўторнасць гістарычна-архітэктурных помнікаў.

Цікава, што праект ладзіўся пры ўдзеле Беларускага грамадска-культурнага таварыства Санкт-Пецярбурга і пры падтрымцы фонду "Созидающий мир": яго стварыў вядомы мецэнат, доктар эканамічных навук, прафесар Вячаслаў Заранкоў. Сам Вячаслаў Адамавіч родам з Беларусі, а ў 17 гадоў пераехаў з бацькамі ў тагачасны Ленінград. І цікавасць у яго да Бацькаўшчыны — заўсёдная. Ён ініцыятар шматлікіх супольных культурных праграм. Дзякуючы яму, іншым беларусам Санкт-Пецярбурга, а таксама Белтэлерадыёкампаніі, мастацкай галерэі "Універсітэт культуры" Беларусь атрымала цудоўны падарунак да Дня Незалежнасці. На выставе прадставілі свае працы ў розных жанрах вядомыя жывапісцы з Піцера: Яўген Анціпаў, Павел Анціпаў, Арсеній Багдасаран, Наталля Бекетава, Антаніна Валодчанка, Ксенія Заварзава, Марыя Пярхун, Павел Пічугін, Ала Прозарава, Іван Тарасюк.

На вернісаж прыехалі прадстаўнікі беларускай дыяспары, якія набылі шырокую вядомасць і павагу за межамі і Беларусі, і Расіі. Сярод іх — выбітны кампазітар, дырэктар Творчага аб'яднання "Маэстра" Леанід Левашкевіч, намеснік старшыні Беларускага грамадска-культурнага таварыства Санкт-Пецярбурга Аляксандр Станкевіч, якія пад час візіту ў Беларусь паказалі ў Мінску і Маладзечне дзве канцэртныя праграмы ў межах праекта "Культурная сталіца Расіі — культурнай сталіцы Беларусі".

А вернісаж быў сапраўдным святам сустрэч. Менавіта такія імпрэзы даюць магчымасць творчым людзям лепей адчуць адзін аднаго, прадставіць творчыя здабыткі, абмяняцца ідэямі. Цікавыя прапановы па развіцці, умацненні міжнародных сувязяў у сферы мастацтва выказалі старшыня Беларускага саюза мастакоў Рыгор Сітніца, саветнік па культуры Пасольства Расіі ў Беларусі Маргарыта Навадворская, заслужаны дзеяч культуры Беларусі Рыгор Сарока. На вернісажы былі старшыня Белтэлерадыёкампаніі Генадзь Давыдзька, народны артыст Беларусі Эдуард Ханок, пляменнік Казіміра Малевіча, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар Ігар Малевіч, старшыня Беларускага фонду міра Максім Місько, доктар культуралогіі, прафесар Аляксандр Смолік, дырэктар выдавецтва "Чатыры чвэрці" Ліліяна Анцух, старшыня Міжнароднага грамадскага аб'яднання мастакоў і мастацтвазнаўцаў "Майстар" Сяргей Крыштаповіч ды іншыя.

Плануецца, што тая ж выстава будзе паказана ў самай буйной выставачнай зале Санкт-Пецярбурга "Манеж", дзе заканчваецца рэканструкцыя. А сяброўскія сувязі, усталяваныя пад час выставы ў Мінску, будуць умацоўвацца. Спадзяемся, з'явяцца і новыя сумесныя цікавыя ініцыятывы з боку творчых асобаў Беларусі ды Расіі.



КАЦЯРЫНА АЛЯКСЕЕВА

**Пра свае творы распавядае прафесар Вячаслаў Заранкоў**



КАЦЯРЫНА АЛЯКСЕЕВА

**Піцерскі беларус Аляксандр Станкевіч на вернісажы**

**Павел Сапоцька,**
дырэктар мастацкай галерэі "Універсітэт культуры"

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ